**Бярэйшык Лілія Уладзіміраўна**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

# ДЗЯРЖАЎНАЯ МУЗЕЙНАЯ ПАЛІТЫКА Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Да 1991 г. музейная палітыка ў Беларусі рэгулявалася агульнасаюзным заканадаўствам, а таксама прынятымі на яго аснове рэспубліканскімі нарматыўнымі актамі. Закон аб музеях и музейнай дзейнасці ў савецкі перыяд айчыннай гісторыі так і не быў прыняты. Не атрымаў належнага юрыдычнага афармлення статус музея. Нарматыўнае прававое рэгуляванне музейнай дзейнасці забяспечвала дзяржаўную падтрымку і стабільнае фінансаванне музейных устаноў, наяўнасць ідэалагічнай значнасці іх дзейнасці. Акцэнт у музейнай працы рабіўся на захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцей, а не на іх сацыялізацыю.

Пасля набыцця беларускай дзяржавай незалежнасці, выключна важнай задачай стала распрацоўка эфектыўнай палітыкі ў сферы культуры. Асноўны заканадаўчы акт быў прыняты ўжо ў 1991 г. Ім стаў Закон «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь», які вызначыў асноўныя прынцыпы рэгламентацыі прававых адносін у культурнай сферы, усталяваў прававыя асновы развіцця культуры.

У рэчышчы агульнанацыянальных задач вялася распрацоўка асноў дзяржаўнай палітыкі ў сферы развіцця музейнай дзейнасці. Не гледзячы на эканамічныя цяжкасці, у 1990–1994 гг. у Беларусі ўзнікла каля 30 новых музеяў, пашырылася структура музейнай сеткі, мянялася сацыяльная місія музея у бок далейшай яго сацыялізацыі, дэмакратызацыі, развіцця яго камунікатыўных магчымасцей як культурнай формы [6, с. 184]. Адкрываліся музеі самых розных тэматычных кірункаў, ад краязнаўчых да прыватных. Развіццё музейнай справы у тых умовах была звязана, перш за ўсё, з працэсам павышэння зацікаўленасці грамадства да сваёй гісторыі і культуры, які ішоў менавіта праз музеі, музейную дзейнасць. Здымаліся ранейшыя абмежаванні Міністэрства культуры і друку ў тэматычнай скіраванасці, плошчаў будынкаў і іх прапарцыянальных суадносін (экспазіцыйная фондавая – адміністрацыйная) пры стварэнні новых музеяў, увасаблялася ў жыццё парада па ўзаемадзеянню вядучых музеяў краіны з маладымі калегамі на стадыі стварэння навуковых і мастацкіх канцэпцый новых экспазіцый. З мэтай пашырэння музейнай сеткі і яе разнастайнасці, дзяржаўнае кіраўніцтва пайшло па шляху стварэння філіялаў вядучых музеяў на базе іх назапашаных калекцый. На канец 1994 г. у складзе дзяржаўнай сеткі налічвалася 139 музеяў. Музейны фонд па каштоўнасцях асноўнага фонду перайшоў мяжу ў 2 мільёны адзінак. Аднак, агульныя праблемы, звязаныя з эканамічным крызісам, сталі аб’ектыўнымі цяжкасцямі ў працэсе перабудовы экспазіцый [7, с. 51-57]. Вельмі актуальнай была праблема падрыхтоўкі кадраў для беларускіх музеяў, што паказвае статыстычны агляд дзейнасці ўстаноў культуры БелІПК на падставе гадавых справаздач музеяў. Так, у 1994 г. 64% супрацоўнікаў дзяржаўных музеяў мелі вышэйшую адукацыю па профілю дзейнасці музея, 4% – спецыяльную падрыхтоўку ў галіне музейнай справы і аховы помнікаў [7, с. 63]. Такое становішча не задавальняла большасць музеяў і не

адпавядала патрабаванням часу. Пераважную большасць у рэспубліканскай музейнай сетцы займалі музеі гістарычнага, комплекснага профілю, да якіх адносяцца і краязнаўчыя музеі. У такіх умовах і пачалася падрыхтоўка музейных спецыялістаў на гістарычным факультэце БДУ, арыентаваная галоўным чынам на гістарычную адукацыйную праграму. У 1992 г. было адкрыта аддзяленне архівазнаўства і музеязнаўства з дзённай і завочнай формамі адукацыі. Базавай стала кафедра крыніцазнаўства і музеязнаўства, створаная рашэннем рэктарата БГУ ад 27 чэрвеня 1992 г. [4, с. 13]. Праз два гады была адкрыта музейная спецыяльнасць на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва.

Распрацоўка новых заканадаўчых дакументаў у 1990-я гг. вялася ў адпаведнасці з міжнароднымі палажэннямі, была скіравана на захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцей, развіццё музейнай справы. Упершыню ў айчыннай гісторыі музейнай справы арганізацыйна-прававыя і эканамічныя гарантыі стварэння і дзейнасці музеяў былі аформлены Законам «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» 1996 г., згодна якому музеі працягваюць на новым узроўні выконваць не толькі сваю асноўную функцыю па збору, захаванню, вывучэнню і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны, але і садзейнічаюць духоўнаму развіццю грамадства, павышэнню адукаванасці насельніцтва, распаўсюджанню ведаў. Магчымасць выканання музеем ролі актыўнай сацыяльнай установы зыходзіць з міжнароднага вопыту паспяховай рэалізацыі на практыцы ідэй новай музеялогіі, распрацаваных у 1980-я гг. У законе зафіксаваны паняцці «музей», «музейная калекцыя», «музейны фонд», упершыню даецца вызначэнне паняцця «гісторыка-культурныя музеі-запаведнікі», поруч з дзяржаўнай прызнаны калектыўная і прыватная формы ўласнасці [3]. Рэалізацыя новых падыходаў спрыяла якасным пераменам у музейнай дзейнасці ў канцы 1990 – пачатку 2000-х гг. Актыўна ўкараняліся новыя тэхналогіі музейнага маркетынгу і менеджменту, экспазіцыйна-выставачнай работы, інтэрактыўныя метады ўзаемадзеяння як з айчыннымі, так і з замежнымі турыстамі.

Практыка выкарыстання Закона «Аб музеях і Музейным фондзе» выявіла шэраг пытанняў і неабходнасць яго ўдасканалення. Да таго ж, прынятне новай рэдакцыі Закона «Аб культуры» прывяло да няўзгодненасці з ім музейнага закона. У 2004–2005 гг. былі распрацаваны Канцэпцыя і Праграма развіцця музейнай справы ў Беларусі, новая рэдакцыя Закона. У ім былі вызначаны асноўныя кірункі дзяржаўнай палітыкі ў музейнай справе: забеспячэнне агульнадаступнасці музейных прадметаў і музейных калекцый, Музейнага фонду краіны, падтрымка навуковых даследаванняў і дзяржаўных праграм развіцця музейнай справы. Закон уключаў пытанні дзяржаўнага рэгулявання ў музейнай сферы, прававога становішча музеяў, парадак іх стварэння і ліквідацыі. Рэгламентаваў крыніцы фінансавання, віды музейнай дзейнасці, асноўныя арганізацыйныя прынцыпы фарміравання і дзяржаўнага ўліку Музейнага фонду, выкарыстанне і захоўванне музейных прадметаў, распараджэнне імі. Прадугледжваў дзяржаўную і прыватную формы ўласнасці на музейныя прадметы і музейныя калекцыі.

Больш дэталёвая распрацоўка і тлумачэнне некаторых артыкулаў Закона былі дадзены ў нарматыўных актах, зацверджаных Саветам

Міністраў Рэспублікі Беларусь. Так, Палажэннем аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь быў вызначаны парадак уключэння музейных прадметаў і калекцый у склад рэспубліканскага Музейнага фонду, іх уліку, захоўвання і выкарыстання, а таксама стварэнне і вядзення Дзяржаўнага каталога [10]. У ліпені 2008 г. пры Нацыянальным гістарычным музеі быў створаны Цэнтр Дзяржаўнага каталога Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь, які распрацоўваў даведнікі, слоўнікі, стандарты апісання музейных прадметаў, а з 2010 г. вядзе ў аўтаматызаваным рэжыме цэнтралізаваны ўлік музейных прадметаў музеяў Беларусі. На сакавік 2018 г. у каталогу было зарэгістравана больш 160 тыс. адзінак: з музеяў дзяржаўнага падпарадкавання – 49,4 тыс., з музеяў Брэсцкай вобласці – 24, 6 тыс.; з музеяў Віцебскай вобласці – 15 тыс.; з музеяў Гомельскай вобласці – 5,2 тыс; з музеяў Гродзенскай вобласці – 30 тыс.; з музеяў Мінскай вобласці – 14,7 тыс. [2].

Указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь былі зацверджаны палажэнні аб парадку прысваення, перыядычнага пацвярджэння, пазбаўлення статусу «нацыянальны» музеяў (2005 г.), перамяшчэння музейных прадметаў і музейных калекцый праз дзяржаўную мяжу (2006 г.) і ацэнкі кошту культурных каштоўнасцей (2007 г.). Пастановай Міністэрства культуры ў 2007 г. была зацверджана «Інструкцыя аб парадку камплектавання музейных фондаў, унутрымузейнага ўліку, навуковай апрацоўкі і захавання музейных прадметаў і музейных калекцый, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў і Палажэння аб фондаво-закупачнай камісіі музея» [11].

У пачатку 2000-х гг. асноўныя кірункі музейнай палітыкі ўключалі структурнае рэфармаванне і інфармацізацыю музейнай дзейнасці, мадэрнізацыю матэрыяльна-тэхнічнай базы, павышэнне прафесійнага патэнцыялу музеяў. У 2005 г. быў вызначаны курс развіцця ў адпаведнасці з рыначнымі умовамі кіравання і гаспадарання. Дзейнасць музеяў была скіравана на пашырэнне платных паслуг. З мэтай павелічэння музейнай аўдыторыі вялася распрацоўка новых экспазіцыйных рашэнняў, разнастайных выстаў, музейна-педагагічных праграм. Назіраўся рост і эфектыўнае развіццё мемарыяльных комплексаў, музеяў-тэрыторый, музеяў-сядзібаў, дзяржаўных музеяў іншых ведамстваў, прыватных музеяў. Пленныя вынікі мела музеефікацыя палацаў і замкаў, была праведзена рэстаўрацыя ў Гомельскім палацава-паркавым ансамблі, Нацыянальным гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Нясвіж». З 2010 г. адкрыты для наведвальнікаў Музей «Замкавы комплекс «Мір» [9, с. 28–30].

Прымяненне Закона аб музеях паказала неабходнасць унясення змяненняў і дапаўненняў у шэраг нормаў, што было ўлічана Законам «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» 2011 г. [1]. Новай рэдакцыяй Закона прадугледжаны кантроль выканання заканадаўства ў музейнай сферы, унесены ўдакладненні ў тэрміналогію і парадак рэгулявання асобных пытанняў музейнай справы. Былі пашыраны паўнамоцтвы Міністэрства культуры, якое пры правядзенні міжнародных музейных выставачных праектаў атрымала права выдаць гарантыйныя лісты аб захаванасці і своечасовым вяртанні культурных каштоўнасцей, што ўвозяцца ў нашу краіну. Раней беларускае заканадаўства не прадугледжвала такой

магчымасці. Дадзеная норма была занесеная ў заканадаўства з мэтай актывізацыі міжнароднай выставачнай дзейнасці беларускіх музеяў. Законам вызначаны асаблівасці прававога становішча і парадку дзейнасці гісторыка-культурных музеяў-запаведнікаў. Таксама прадугледжана складанне нацыянальнага рэестра музеяў і ўключэнне ў Дзяржаўны каталог Музейнага фонду не ўсіх, а найбольш каштоўных музейных прадметаў. У адпаведнасці з новай рэдакцыяй Закона былі ўнесены змяненні ў дзеючыя нарматыўныя дакументы. Міністэрствам культуры былі падрыхтаваны і зацверджаны новыя нарматыўныя дакументы: Палажэння аб рэестры музеяў, Палажэнне аб дзейнасці Рэспубліканскага савета дырэктараў. Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 13 кастрычніка 2011 г. было зацверджана «Палажэння аб асаблівасцях прававога статусу музея пад адкрытым небам, яго аховы і выкарыстання».

Вынікам непарыўнага развіцця і ўдасканалення заканадаўчай базы у сферы аховы і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны стала прыняцце і ўведзены ў дзеянне з 3 лютага 2017 г. Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры. У новым дакуменце кадыфіцыравана больш 60 нарматыўных прававых актаў, у тым ліку сем законаў, чатыры указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, каля 50 пастаноў Урада і Міністэрства культуры краіны. Рэгламентаваны пытанні стварэння, рэарганізацыі і ліквідацыі ўстаноў культуры. Вызначаны місія і статус музея, мэта і галоўныя кірункі музейнай дзейнасці, асноўныя паняцці, звязаныя з фарміраваннем музейнага фонду і музейнай дзейнасцю [6]. Згодна Кодэксу аб культуры сістэма дзяржаўных музеяў фарміруецца з устаноў, падпарадкаваных Міністэрству культуры і мясцовым выканаўчым і распарадчым органам абласнога і базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, а таксама падпарадкаваных іншым дзяржаўным органам і дзяржаўным юрыдычным асобам. Удакладняецца статус і прававое становішча музеяў пад адкрытым небам, музеяў-запаведнікаў, якія могуць мець сваю ўласную сімволіку, ажыццяўляць дзейнасць па раслінаводству, жывёлагадоўлі, вытворчасці тавараў народнага ўжытку, з выкарыстаннем тэхналогій і прылад працы, якія выкарыстоўваліся ў адпаведны гістарычны перыяд [8, с.45-47].

Сучасны этап культурнага жыцця краіны характарызуецца ростам музейнай сеткі. Сёння ў Беларусі дзейнічаюць 159 музеяў сістэмы Міністэрства культуры, 1,5 тыс. сістэмы Міністэрства адукацыі, каля 200 іншых ведамстваў, 14 прыватных. Стабільная станоўчая дынаміка з'яўляецца вынікам дзяржаўнай падтрымкі музеяў, разумення неабходнасці прыстасавання да новых гістарычных умоў, зацікаўленасці грамадства ў захаванні і музеефікацыі гісторыка-культурнай спадчыны.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь»: Закон Рэспублікі Беларусь, 3 ліпеня 2011 г. № 281-З // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2011. – № 78. – 2/1833.
2. Государственный каталог Музейного фонда Республики Беларусь // Национальный исторический музей Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – 2017. – Режим доступа: http://www.dkmf.by/about. – Дата доступа: 3.09.2018.
3. Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 верасня 1996 года "Аб музеях і Музейным фондзе

Рэспублікі Беларусь" // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1996 г., N 28, арт. 512).
4. Кафедра источниковедения: 10 лет творчества // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны: навук. зб. Мінск : БДУ, 2002. Вып. 1. – С. 12-19.
5. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – 2017. – Режим доступа : http://pravo.by . – Дата доступа : 15.09.2018 г.
6. Культура Беларуси : 20 лет развития (1991–2011) : монография / С. П. Винокурова [и др.] ; под общ. ред. О. А. Галкина, И. Г. Голубевой. – Минск : Институт культуры Беларуси, 2012. – 332 с.
7. Культурнае жыццё рэспублікі. Стан, праблемы, тэндэнцыі. Статыстычны агляд тэатральна-відовішчных і культурна-асветных устаноў сістэмы Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь за 1994 год. – Мінск: Беларускі інстытут праблем культуры, 1995. – 85 с.
8. Мартыненко, И.Э. Музейное дело как направление культурной деятельности: новые подходы в Кодексе Республики Беларусь о культуре /И.Э. Мартыненко // Веснік ГрДУ імя Янкі Купалы. Сер. 4. Правазнаўства.- 2017 . – Т.7. – № 4. – С.42-52.
9. Музеі Беларусі: Праблемы. Перспектывы. Інавацыі : Экспазіцыйна-выставачная дзейнасць , уклад., пер. з рус. мовы, агул. рэд. І.Б. Лапцёнак. – Мінск : ДУА «Інстытут культуры Беларусі», 2012. – 231 с.
10. Постановление «Об утверждении Положения о Музейном фонде Республики Беларусь» 2006 г. № 730 // Сайт «Музеи Беларуси» [Электронный ресурс]. – 2013. – Режим доступа: http://museum.by/node/14373. – Дата доступа : 15.02.2016
11. Правовая информация // Сайт «Музеи Беларуси» [Электронный ресурс]. – 2013. – Режим доступа: http://museum.by/node/13503. – Дата доступа : 15.02.2016.

**Важник Ольга Николаевна**

*Академия управления при Президенте Республики Беларусь (Минск, Беларусь)*

## БЕЛАРУСЬ ПОСЛЕ ВТОРОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ: РАЗВИТИЕ В РАМКАХ СЭВ

При рассмотрении взаимодействия Беларуси с европейскими государствами после Второй мировой войны, необходимо учитывать ряд факторов и в первую очередь геополитическое положение республики. Выгодное экономико-географическое расположение Беларуси по отношению к европейским странам, сравнительно небольшое расстояние между центрами производства и потребления продукции, общая граница с ПНР – все эти факторы являлись важным условием активного участия Белорусской ССР в экономическом, научно-техническом и культурном сотрудничестве Советского Союза со странами социалистического лагеря.

На территории Беларуси размещались многочисленные предприятия общесоюзного значения, которые осуществляли выпуск продукции для нужд военно-промышленного комплекса государства. Они оснащались новейшим отечественным и зарубежным оборудованием, выпуская продукцию мирового уровня. Тут концентрировались наиболее квалифицированные кадры инженеров, техников, рабочих. В республике, особенно в Минске, была создана сеть экономических и отраслевых научно-исследовательских институтов, конструкторских бюро, лабораторий, которые занимались научно-исследовательской работой, внедрением ее результатов в производство. В то же время следует отметить, что